Год II — Серада, 15 лютага 1922 г. — № 31

РАНІЦА

штодзенная грамадзкая, палітычная і літэратурная газэта

АДРЭС РЭДАКЦЫІ і КАНТОРЫ:
Вільня, Афярная № 4, кв. 2.
Рэдакцыя адчынена што дня, апрача сьвят, ад 11 да 1. Адміністрацыя—ад 10 да 3.

Цана нумару 20 марак,
Падпіска на 1 мес. . . 400 марак.
З перасылкай на 1 „ . . 500 „
За граніцу ў два разы даражэй.

ЦАНА АБВЕСТАК:
За адзін радок звычайнага друку на 1 стр.—60 м.
ў тэксьце . . . . . . 75 м.
за тэкстам . . . . 40 м
Для шукаючых працы на 10 проц. танней.

ТЭЛЕГРАМЫ.

МАСКВА 14. II. (А. У.). Згодна паведамленьняў добра паінфармаваных колаў, пастанова У. Ц. І. К. ў справе скасаваньня чрэзвычаек была аблічана толькі на эфэкт, прынцыпова-ж гэтая пастанова з'яўляецца толькі цераменаю дэкарацый. Функцыі чрэзвычаек цалком пяройдуць да „палітычных упраўленьняў", якія і будуць выпаўняць абавязкі чрэзвычаек. Новая інстытуцыя будзе мець 50 процэнтаў даўнейшых чэкістаў. Рэшта чэкістаў будзе прыдзелена да рожных інстытуцыяў, што толькі павялічыць шпегоўства.

РЫГА 14. II. (А. У.). З прычыны хутка маючых адбыцца выбараў у Гарадзкую Раду, утварыўся Польскі Выбарчы Камітэт, які мае замер правясьці сваіх прадстаўнікоў. Выбары адбудуцца ў пачатку сакавіка.

ЛЬВОУ 14. II. (А. У.). Да Драгабыча хутка прыбудзе дэлегацыя эстонскага Ўраду, з мэтай пазнаёміцца з нафтаваю прамысловасьцю, якая для Эстоніі мае вялікае значэньне.

РЫМ 14. II. (А. У.). Рымскія палітычныя кола ўсё болей з'яўляюцца прыхільнымі да француськага становішча ў справе адлажэньня Гэнуэскай конфэрэнцыі, тым болей, што да гэтага часу ня ёсьць пэўным, ці атрымае Бономі большасьць у парлямэнце, што выклікала-б новы міністэрскі крызіс.

БЭРЛІН 14. II. (А. У.). Справа міністэрскага крызісу да гэтага часу бяз зьмены. За даверые цяперашняму канцлеру высказаліся соцыялісты і большасьць дэмократаў, становішча нямецкай народнай партыі і нязалежных соцыялістаў яшчэ не выяснена.

Палітычныя весткі.

У Ковенскай Літве.

Прэзыдэнт Гальванаускас падаў ў Раду Міністраў аб'ясьненьне, ў якім нападае на Польшчу за яе палітыку ў віленскай справе, аднак ён высказаўся за зблізкэньне Літвы да Польшчы. Паводле слоў Гальванаўскаса, Літва як і вялікія дзяржавы, імкнецца да ўстановы міра. Літва хоча зліквідаваць у сябе нямецкую валюту і разлічыцца з немцамі ў справе ваенных шкодаў. У адносінах з Расеяй Літва будзе трымацца мірнага дагавора.

Канстытуцыйная камісія Ковенскага Сойму прыняла ў першым чытаньні праэкт культурнай аўтаноміі нацыянальных меншасьцяў. Гэты праэкт працугледжвае аўтаномію для нацыянальных меншасьцяў тых, якія маюць ня менш як 10 проц. насяленьня Літвы, ўключаючы сюды і Віленшчыну (?)

Каранацыя Папы.

Адбылася ў Рыме ў Базыліцы Сьвятога Пятра ўрачыстая каранацыя Папы. На пляцу сабралася каля 100 тысяч асобаў. На імшы, якую адпраўляў Папа, былі прысутнымі 52 кардыналы. Пасьля каранацыі, Папа благаславіў народ з надворнага балькону Базылікі.

Урадавы крызыс у Італіі

Думаюць, што на паседжаньні палаты ў чацьверг, габінэт Бономі атрымае выражэньне давера, пасьля чаго будзе прыступляна да частковай рэканструкцыі габінэту. Крызіс, такім парадкам, яшчэ цягнецца.

Паўстаньне ў Карэліі

На карэльскім фронце становішча бяз зьмены. Тымчасовы Карэльскі Урад выдаў дэкрэт аб мабілізацыі ўсіх мужчынаў ад 18 да 45 гадоў.

Бальшавікі і царкоўныя скарбы.

Маскоўскія бальшавіцкія газэты трэбуюць адабраньня царкоўных скарбаў для скарыстаньня іх на барацьбу з голадам.

Аб конфэрэнцыі у Генуі.

Францускі Урад запрапанаваў Англійскаму Ураду, адсрочыць конфэрэнцыю на другі час. Англійскі Урад на гэту прапазыцыю ніякага адказу яшчэ ня даў. Лёйд-Джордж проціў адсрочкі конфэрэнцыі і, здаецца, адказ на прапазыцыю Францускага Ураду будзе адмоўны. Лёйд-Джордж лічыць, што нельга траціць часу ў імкненьні да ўзвароту гаспадарчай раўнявагі.

Дзеля таго, што Францыя хоча адсрочыць конфэрэнцыю, Злучаныя Штаты Амэрыкі ўстрымоўваюцца ад адказу, ці будуць яны прыймаць удзел ў гэтай конфэрэнцыі ці не, думаючы, што адсутнасьць Францыі зрабіла-б конфэрэнцыю безкарыснаю.

Паўстаньне на Украіне.

(Глядзі № 29 „Раніцы").

У палітычных адносінах Надбужанскі партызанскі корпус саўсім незалежны і глаўнай сваей мэтай мае барацьбу з бальшавікамі.

Прыхільныя да корпусу палітычныя арганізацыі працуюць з ім у контакце. Камандны склад корпуса—руска-беларускі. Шмат ёсьць афіцэраў з Савецкай Беларусі, з Народнай Ахвотніц-Арміі генэрала Булак-Балаховіча і зялёнадубцаў.

Літэратура выдаецца ўкраінская і руская. У ўнутраных службовых адносінах прынята мова ўкраінская, апроч чатырох атрадаў, ў якіх ужываюць расейскую мову. Але па за службай ўжываюцца ўсе мовы.

Усе весткі, якія час ад часу з'яўляліся ў газэтах, аб істнаваньні ў складзе корпуса жыдоўскага атраду д-ра Рабіновіча—ня верныя. Атрад Рабіновіча ня істнуе.

У Падольскай губ., районам дзейнасьці паўстанцаў, апроч Балцкага павету, з'яўляецца Леціčэўскі, дзе знаходзіцца дывізія атамана Шэпэля. Праца гэтай дывізіі сустрачае труднасьці дзеля блізасьці граніцы і вялікага ліку бальшавіцкага войска.

Лік паўстанцаў ў Падольскай губ. у студні дасягаў 10 тыс. чалавек. Недастачы ў харчах няма і паўстанцы лёгка дачакаюць вясны.

У Валынскай губ. паўстанчых атрадаў няма, але час ад часу з'яўляюцца паўстанчыя атрады з суседніх губэрняў.

Насяленьне адносіцца да паўстанцаў вельмі прыхільна, але само актыўнага ўчасьцьця ня прыймае.

У Кіеўшчыне ёсьць шмат мнагалічных і добра арганізованых паўстанчых атрадаў, якія маюць пасьпех.

У паўночнай частцы істнуюць атрады Кліменка і Богатіевіча. Першы захапіў Чорнабыльскі раён і там цьвёрда абаснаваўся. Атрад Кліменка, якім да апошняга часу камандаваў вядомы атаман Струк, прызнае ўласьць Пятлюры і падпарадкаваўся дырэктывам загранічнага паўстанчага цэнтру. Але дзейнасьць гэтага атраду не адзін раз выклікала нараканьні, насяленьня і гэта псавала агульнае становішча партызанаў.

Лінія Фастаў—Казацін знаходзіцца пад пагрозай з боку атраду Орліка, які не раз пераносіў сваю дзейнасьць і на поўнач на ліні Кіеў—Карасьцень. Атаман Орлік карыстаецца вялікай павагай сярод насяленьня Кіеўшчыны.

Старэйшым у Кіеўшчыне партызанскім атрадам з'яўляецца атрад Валынца, які знаходзіцца на поўнач ад Гумані.

На граніцы Кіеўшчыны і Херсоншчыны аперые падпаручык Іваноў. Гэта атрад расейскі і арыентацыя яго так званая „Урангелеўская". Але ў апаратыўных адносінах ён падпарадкаваўся Набаужанскаму корпусу атамана Заболотнага.

У праваберажнай частцы Екатерынаслаўшчыны знаходзяцца невялічкія атрады Махно.

На левым берагу Дняпра найбалей актыўны, у сэнсе барацьбы партызанаў с бальшавікамі: Чарнігаўшчына і Палтаўшчына.

Партызанскія атрады на левабярэжжы ў пачатку невялічкія, цяпер аб'едналіся ў буйныя. Агульнае камандаваньне ўсімі паўстанцамі на Чарнігаўшчыне знаходзіцца ў руках атамана Ангела, а Палтаўшчыны ў рукох атамана Шубы.

У Харкаўшчыне застаўся толькі адзін даволі вялікі атрад атамана Васільева, які працуе ў раёне Ахтырхі і Суі. Уся ўсходняя частка Харкаўшчыны і левабярэжная частка Екацярынаслаўшчыны заўсім свабодныя ад паўстанцаў.

Паўстанцы добра разумеюць, што добрыя адносіны насяленьня з'яўляюцца фундамантам іх дзейнасьці і дзеля гэтага робяць усё, каб адгарадзіцца ад бандытаў, якія прыкрываюцца назвай паўстанцаў. Не адзін раз бывае, што паўстанцы ўступаюць у барацьбу з бандытамі і вынішчаюць іх да чыста.

Цяперашняя зіма з'яўляецца як для ўкраінскага, так і для беларускага паўстанчага руху цяжкай справай, але ўжо цяпер ёсьць магчымасьць з пэўнасьцю сказаць, што паўстанцы вытрымаюць гэтую спробу.

У сваёй барацьбе з бальшавікамі, ўсе паўстанцы чураюцца ўсякай партыйнай палітыкі, бо яны ўжо добра зразумелі патрэбу цеснага аб'еднаньня.

У цяперашні час усе партызаны на Украіне ў ваенна-апэратыўных адносінах цадпарадкаваны аднаму апэратыўнаму цэнтру.

Дух паўстанцаў моцны і добры. Яны пэўны, што бальшавіцкі ражым дажывае апошнія дні.

Нецярпліва чакаюць вясны, чакаюць сыгналу, каб пачаць акцыю проці насільнікаў.

В. А.

Дапамога бежанцам.

(Весткі з Варшавы)

Камітэт дапамогі бежанцам пры Сойме, атрымаўшы ліст ад польскага консулата у Харкаве аб жудасным становішчы бежанцаў з Польшчы і Беларусі, якія змушаны да гэтага часу заставацца у Харкаве, адправіў для іх адзін вагон з харчамі. У найбліжэйшых днях Камітэт вышле яшчэ некалькі вагонаў з харчамі для бежанцаў у Пяцербург, Маскву і у Сібір.

Віцэ Прэзэс камітэту Януш, выехаў 5 лютага у Пазнань паездка гэтая зьвязана з прапазыцыей аб пашырэньні дзейнасьці Камітэту.

З Масквы атрыманы весткі, што тры эшалоны польскіх рэпатрыантаў, якія выехалі з Масквы у палове студня, церпяць у дарозе страшныя мукі. З прычыны недастачы харчоў і дрэнных санітарных варункаў 60 прац. рэпатрыантаў захварэла.

З ГАЗЭТ.

Расейская газэта „Общее Дѣло," якая выходзіць у Парыжу над рэдакцыяй Бурцэва, друкуе пратэст парыжскай групы партыі Народнай Свабоды проціў прызнаньня савецкай улады, ў якім пералічваюцца ўсе нявыгадныя для Расеі і Эўрапэйскіх дзяржаваў вынікі гэтага прызнаньня.

„Усе тыя аўтары праектаў эксплёатацыі Расеі робяць вялікую абмылку, думаючы, што бальшавікі будуць іх паслушнымі памоцнікамі і выпаўняць іх пляны. Находзячыся на краю гібелі, бальшавікі абяцаюць усё што хочаш. Але абяцанкі, перагаворы, конфэрэнцыі ў іх вачах ёсьць толькі перадышка на шляху паступовага руху Трэцяга Інтэрнацыяналу да ўсясьветнай рэвалюцыі.

Патрэбны не прызнаньне савецкай улады, не конфэрэнцыі і ўмовы з ёю, а бяспашчадная барацьба.

„Украінская Трыбуна" зьмешчае размову супрацоўніка Руспрэса з праваслаўным экзархам у Варшаве Георгіем, быўшым епіскапам Менскім. Размова была аб украінізацыі праваслаўнай царквы на Украіне, але яна мае прынцыповы характар і сьведчыць аб вялікай зьмене ў поглядах вышэйшых кіраўнікоў праваслаўнай царквы на роль яе ў палітыцы.

Між іншым Экзарх сказаў:

„Справа ўкраінізацыі царквы ў Польшчы, ў Валынскай епархіі, ідзе інтэнсыўна, казаньня гаворацца па ўкраінску, а служба Божая на ўкраінскай мове адбываецца нават епіскапам Дыянісіем, да слова кажучы, з дзеда-прадзеда маскалём.“

Далей газэта піша:

Архіепіскап Георгій сказаў, што ён лічыць канечным даць магчымасьць кожнаму народу маліцца ў роднай мове. Каб быў добры пераклад багаслужбовых кнігаў на ўкраінскую мову, то ён бы ахвоча дапусьціў службу Божую на гэтай мове. Згодна славам архіепіскапа Георгія, праваслаўнае духавенства на Валыні, за выключэньнем некалькіх сьвяшчэньнікаў-маскалёў, не праціўляецца ўкраінізацыі тэксту. У украінізацыі тэксту Экзарх бачыць магутны спосаб барацьбы з уніяцтвам, якое карысталася ўкраінскаю моваю, як аружжам для сваей рэлігійнай прапаганды.“

У канцы размовы Экзарх сказаў, што ён ня лічыць магчымым, каб праваслаўе ў Польшчы адыгрывало роль аружжа „русыфікатарскай“ палітыкі.

Як бачым, царкоўная справа на Украіне знаходзіцца ў лепшым становішчы, чым на Беларусі. Тлумачыцца гэта вялікшай нацыянальнай сьвядомасьцю Украінскага духавенства, чым беларускага, якое да гэтага часу нічога ня зрабіло ў гэтым напрамку.

Ня трэба здаецца гаварыць многа аб тым, што вельмі пажадана, каб набажэнства, а ў першую чаргу казаньня, адбываліся на Беларусі ў мове беларускай.

⟡⟡⟡⟡

Адказ „беларусу“, Вязанскай вол., Вяпейскага пав.

(Ліст у рэдакцыю).

Прачытаўшы ў № 2 (24) газэты „Беларускі Звон“ заметку з Вязані, я вельмі пакрыўджаны лгарствам і дарэмнай зьнявагай гэнага „беларуса“, з маскоўскага капыла.

Ен піша аб тым, што мы сяляне Вялейскага павету не выбіралі нікога на Зьезд Заходняй Беларусі.

Магчыма, што гэты „беларус“ Вязанскі дзеля—сваіх пераканаНьняў нікога і нявыбіраў, але-ж за тое, мы сяляне Краснасельскай, Радашкоўскай і Хаценскай, а гэтак сама і Лябядзеўскай гмін, выбралі дэлегатаў, аб чым навет напісалі пратаколы, якія перахоўваюцца ў справах Зьезду З. Б.

Я сам, Краснасельскай гміны, беларус, будучы на зьездзе, на які быў выбраны сялянамі сваей вёскі, сьведчу: на зьездзе былі беларусы-дэлегаты з усіх куткоў Заходняй Беларусі, ад сялян, ад розных беларускіх партыяў і арганізацыяў.

Што датыча да беларускіх школ, у нашым павеце, дык я параю „Беларускаму Звону“ і гэнаму маскалю з Вязані паслаць аглядатага, хаця-бы, весь у якія гміны Вялейскага павету, каб паглядзець добра: у Радашкоўскую воласьць: в. Путнікі, Сычавічы; ў Краснасельскую—Вялікі Бор; у Хаценскую—в. Хранцова, Карповічы; Лябядзёўскую, в. Запалякі і давёдаўшыся колькі іствуе там, дзякуючы „Краёвай Сувязі“ беларускіх школ, перастаць званіць хвальшывым звонам, які ўсё роўна не затуманіць ужо нам сялянам мазгоў.

1922 6.2. Краснасельская гміна Дзед Тадэуш.

⟡⟡⟡⟡

Эканамічны крызіс.

Усесьветная вайна і рэвалюцыйны рух стварылі эканамічны крызіс, які захапіў ня толькі тыя дзяржавы, якія прыймалі безпасрэднае вучасьце у гэтай вайне, але амаль ня усе дзержавы сьвету.

У Польшчы, якая шмат пацярпела ад ваеннай акцыі, ад нямецкай акупацыі і ад бальшавіцкай навалы,—лік безработных да 1 жніўня 1921 г. дасягаў 65 тысячаў. Пасля гэтага тэрміну прамысловы крызіс шпарка павялічыў лік безработных: у верасені 1921 г. ва ўсей Польшчы зарэгістравана 70 тыс., у кастрычніку 80 тыс., у лістападзе ужо 120 тыс. і у сьнежні 170 тыс.

У іншых дзяржавых Эўропы, Францыя і Германія меней усяго церпяць ад безрабоцьця.

Францыя, у якай значная частка тэрыторыі, так сама была зьнішчана за час усесьветнай вайны, цярпела ад безрабоцьця ад сьнежня 1920 году до лютага 1921 г., калі лік застаўшыхся без працы з 40 тысячаў павялічыўся да 89 тыс. У верасьні лік безработных зьменьшыўся адразу да 21700 і далей мае тэндэнцыю да далейшага зьменьшэньня.

Германія, якая перахавала сваю прамысловасьць, саўсім ня цярпела ад безрабоцьця. У пачатку 1921 году у Германі было толькі 4½ прац. застаўшыхся без працы, а у канцы году лік безработных зьменьшыўся да 1 прац.

З усіх эўрапэйскіх дзяржаў найболей цярпіць ад безрабоцьця Англія, Тлумачыцца гэта з'явішча тым, што высокая валюта затрымлівае транспорт і выклікае аграніченьне прадукцыі. У цяперашні час у Англіі лічыцца 14½ міл. рабочых, з якіх 10 прац застаюцца бяз працы. Такі вялізарны лік безработных, разумеецца, з'яўляецца пагрозай эканамічнаму дабрабыту англійскай дзяржавы і можа выклікаць небясьпеку з палітычнага боку.

Бэльгія на 600 тыс. рабочых, у палове 1921 году, мела 31 с пал. проц. безработных. Лік іх у паперовай прамысловасьці дасягаў да 65 проц.

У Галандыі у лютым 1921 г. было 16 с пал. прац. безработных, а у лістападзе толькі 13 прац.

У Швэйцарыі у сьнежні 1921 г. было 55 тыс. безработных, у Даніі 25 прац. у Швэцыі 80 тыс., у Норвегіі 50 тыс, у Італіі 250 тыс. у Аўсгрыі 30 тыс.

У Амэрыканскіх Злучаных Штатах на 6 міл. рабочых выпадае безработных 20 прац.

⟡⟡⟡⟡

ХРОНІКА.

„Першая ластаўка“.

„Gazeta Krajowa“ паведамляе, што расейская гандлёвая місія з п. Сорэзаковым на чале зрабіла умову з Акцыян. Таварыствам „Polski Llojd“ у Варшаве аб дастаўцы у Расею Лодзінскай і Беластоцкай мануфактуры на колькі мільёнаў польскіх марак. Гэткім чынам Савецкі Урад завязаў першыя безпасрэднія гандлёвыя адносіны з Польшчай, што будзе мець вялікі ўплыў на наш гандлёвы рынак.

Місія Гельжынскага.

Як паведамляе „Unser Tog“ шэф палітычнай канцэляры рады міністраў п. Гельжынскі, прыбыўшы ў нядзелю ў Вільню, меў нарады з прадстаўнікамі рожных палітычных партый. Мэта нарадаў — сагласаваць пазыцыю Віленскага Сойма з пазыцыяй польскага ўраду ў справе рэзалюцый аб лёсах Віленшчыны. Нарады адбываюцца з удзелам дэлегата Польскай Рэчыпаспалітай Солтана.

Мінімум заработнай платы.

Па стаўкам профэсыянальных—саюзаў мінімум заработнай платы рабочага з'яўляецца 1600 марак у дзень.

Прадстаўнікі Лігі Народаў у доктара Выгодзкага.

У пятніцу вечарам у д-ра Выгодзкага былі старшыня кантрольнай камісіі Лігі Народаў палкоўнік Шардыньі і яго замясьціцель палкоўнік Ласіч. Сябры Лігі народаў прабылі ў доктара больш як гадзіну.

———

Беларускае жыцьце.

Школьная справа.

Да 1-га лютага г. г. у Цэнтр. Кам. Краёвай Сувязі паступіло болей як 300 прыгавараў аб адкрыцьці беларускіх школ. Усе прыгавары адасланы да адпаведных школьных уладаў.

Раскол у Бел. Нац. Кам.

У апошнія часы ходзяць чуткі аб паважным крызісе ў Беларускім Нацыянальным Камітэце, выкліканым выступленьнямі групы п. Луцкевіча на паседжаньні Камітэта помачы афярам вайны.

У Беларускім Муз.-Драматычным Гуртку.

5, 7 і 12 лютага г. г. ў памэшканьні Беларускага Муз.-Драматычнага Гуртка адбыліся тры паседжаньні, разважаўшыя пытаньні аб зацьвярджэньні бюджэту на 1922 год, а так-сама выбараў новай рады старшынь. Першае паседжаньне прайшло надта бурна. Старшыня п. Смоліч з трудом мог кіраваць паседжаньнем. Апошнім паседжаньнем кіраваў п. Трэпка. У раду старшінь, выбраны: Ярэміч, Валэйша, Канапацкі, Багдановіч, Чапановіч, Біндзюк, Маркевіч, Шчансновіч, Знамяроўскі, Більдзюкевіч і Куніцкі. (Віл. Рэчь).

Казка.

У нейкім царстве, ў нейкім гасударстве, й не за трыдзевяць гарамі, й не за семдзевяць марамі, а на шырокай плошчы, сярод лясоў драмучых, сярод балот трасучых, ля рэчак ў сьвет бягучых жыў народ.

Лікам не вялікі, сілай не магутны, славай не так знаны, — а так як ўсякі іншы пад сонцам, пад небам на гэтым сьвеце Божым.

Жыў народ супішна, сам сябе ня крыўдзіў, другіх ня трывожыў, сумленна працавіта араў сабе і сеяў, лавіў зьвяроў і рыбу, зьбіраў мядок ліпавы, складаў багам ахвяры.

Каб век свой прыздобіць—пеяў ён песьні гучна, тварыў легенды складна, ткаў з срэбра — злота шаты, піў мёд салодкі, хмельны.

Ен жыў-бы так мо й доўга, каб не адна ў ім вада: ўжо надта далікатны, душою шчыры—просты, характарам падатны. Калі яго хто крыўдзіў, ён выбачаў пакорна і аддаваў багацьце, мяркуючы па людзку:

— Нихай бярэ нябога,—иусяць яму іначшай няма на то дарогі,— а я сабе дам рады... Што-ж, біцца з ім, спрачацца?—ці варта траціць словы. ці ліці кроў людзкую?... Пад небам Божым людзі—павінны жыць у згодзе і праўда быць павінна. Бо грэх сягоньня ўчыніш, а заўтра пакаяньне...

Такі то нораў мелі жывучыя там людзі у гэтым добрым царстве, ў гэтым гасударстве, што й не за гарамі і не за марамі, а на шырокай плошчы сярод лясоў драмучых сярод балот трасучых ля рэчак ў сьвет бягучых.

Іншы вякі чаргою — плыла бяда ліхвою.

Лянiўцы, дармаеды пайшлі туды гурбою, у тое наша царства, ў тое гасударства.

Хапала хлеба, мёду, хапала скур зьвярыных.

Усяго аж надта мелі, пілі сабе і елі, нічога не рабілі, гатовае глумілі, клусьцелі і шалелі...

Народ цярпеў, — нічога, — ніхай сабе пабудуць, мо сорам вочы выесьць.

Ды толькі йначай стала: бяз дыму сорам лёгкі, дык вочы й ня міргаюць. Тым болей калі салам, як гноем запльіваюць...

І пачалася ў царстве, ў тым нашым гасударстве ні царства й не парадак, а нешта так брыдкое, што сорам і сказаці, каб тым імём назваці.

Зладзеі-дармаеды занадта задаліся і проста загадалі ўсяму таму народу — што дзень і акуратна падаткі зносіць гэтак: хто мая бохан хлеба — здаць мусе два с паловай; хто мае курку-носку — капу яёк што месяц здае ў падатак „пану“ і курыцу самую што тыдзеньна сьнеданьне; а масла, сыры, млека патрэба здаць, хоць трэсьні, ад усіх галоў па роўні: з рагатых не рагатых, з вала то, ці з каровы, ці з той цялушкі рабай, што нейдзе шчэ ў праэкце, а мо й бычком быць мае...

Ня сьмейся, дзеткі, слухай, не жарт кажу, а праўду — ад клустасьці ці з сьпячкі ў іх розум быў не надта. Здавалась гэтым людзям, што хлеб расьце на дрэве, каровы дояць з носу, а „мужычок-карміле“ з пясочку робіць проса... Ды толькі ён лянівы і ціснуць яго трэба, а сьціснуць як належыць, дык срэбра і чырвонцы з яго жыўём палезуць...

Дык смухайце-ж, падаткі плаціць было патрэба. Прывозіць іх пад ганак, і зняўшы шапку ждалі, пакуль іх мосьць устане і скажа каб прынялі. Пасьля ўжо як прымуць, аблаюць і паклічуць да тога мосьця — чына ў мундуры ці ў храку: Ну што-ж, мужык праклятьі,—спытае ўжо ён важна, - чаму гатунак дрэнны? Чаму мука благая? Чаму і і сыр і млека сьметаны мала мае? — Нарэшце збэсьціць, злае, па носі пстрычку ўсмаліць і гэтак запытае: — Ці жонка маладая? Дачок ці добрых маеш?...

. . . .

Усё на сьвеце мудра, усё на сьвеце складна, бо ўсё ў ім да часу і ўсё канец свой мае. Так было і ў царстве, ў тым нашым гасударстве што і й не за гарамі і не за марамі, а на шырокай плошчы сярод лясоў драмучых, сярод балот трасучых, ля рэчак ў сьвет плывучых.

Людзі таго царства думалі гадалі, склікалі нараду і гэдык сказалі:

— Годзі будзе, годзі! Дрэнна робіць злодзей, што крадзе і пішчыць, але дрэнна й тое, калі ўсе мы людзі будзем патураці злодзеявай працы.

— Годзі будзе, годзі! Хай ідзе нябога, куды яго дарога, й наша яму рада кінуць нас на векі. А не паможа слова, дык памогуць рукі!..

— Годзі будзе, годзі! Бо пад небам Божым людзі жыць павінны гонарна, як людзі: праўды пільнаваці, грэх не патураці. Бо грэх расьце у гору, —сягоньня ён ня значны, а заўтра будзе спорьі...

Гэдык варашылі, гэдык і зрабілі.

Прыгавар народны—прыгавар нязьменны сільны і кароткі:

— Забірай манаткі і вынасься шпарка!

Затрасьліся фалды лапсардакаў чорных, гузікі блiснулі чарапкамі з хаты, і аж пыл падняўся, як мігцелі пяткі, калі уцекалі „чыны ад падаткаў“...

. . . .

І ізноў у тым царстве, у тым гасударстве, што не за марамі і не за гарамі, а на шырокай плошчы, сярод лясоў драмучых, сярод балот трасучых й рэчак ў сьвет бягучых пачалі жыць людзі як даўней, як калісь і не зналі гора, як і ўсе пад небам, як усе пад сонцам людзі другіх царстваў, што на сьвеце Божым.

Язэп Піліпаў.



Радактар-Выдавец: Вацлаў Адамовіч. Друкарня „Друк“ Субач 2.